Oplata pocztowa
uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ ДОЛЯ

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Падпіска на адзін месяц з даставкай да хаты 2 зл. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

№ 1. Вільня, Нядзеля, 11-га студзеня 1925 г. Год I.

Пачатак адступленьня.

Паскольку ў этнаграфічнай Польшчы зямельнае пытаньне мае выразна сацыяльны характар, пастольку на землях Заходняе Беларусі (так сама, як і на ўкраінскіх абшарах) гэтае самае пытаньне разглядаецца ўсім, як ёсьць, польскім грамадзянствам, як адзін з момантаў польскае нацыянальнае палітыкі на „Крэсах“,—тачней: польскага „крыжавога паходу“ на беларускія і ўкраінскія прасторы.

Дый гэтага ніхто ня ўкрывае і ня лічыць патрэбным укрываць: закон аб вайсковым асадніцтве—найлепшы доказ гэтага!

Агульна ведама, што ў Заходняй Беларусі польскі элемэнт прадстаўлены бадай выключна клясай зямляўласьнікаў—буйных і сярэдніх. Вось жа ясна, што—з увагі на рэзкую супярэчнасьць клясавых інтарэсаў польскіх абшарнікаў і беларускага сялянства—аб чейкім запраўдным нацыянальным уплываньні панскага двару на нашае сялянства ніколі не магло і ня можа быць гутаркі! Дый так яно ад вякоў тут вялося, што панскі двор і беларускае сялянства—гэта заўсёды былі і ёсьць два зусім розныя, узаемна далёкія і чужыя, калі ня яўна варожыя сабе, сьветы. Апалячываньне беларусаў, паскольку яно ў нас адбывалася, вялося фактычна не панамі, а бадай выключна панскімі служкамі і каталіцкімі ксяндзамі.—Дужа добра разумеючы гэта, кіраўнікі польскае палітыкі пад лозунгам „Drang nach Osten“ і надумалі выкарыстаць дзеля апалячываньня беларусаў ня гэнае далёкае і нялюбае народу польскае панства, а польскіх сялян-беззямельнікаў, былых жаўнераў, надзяляючы іх зямлёй на Беларусі. Жывучы блізкім да нашага сялянства жыцьцём, гэтыя польскія асаднікі і павінны былі памалу, няўзнак уплываць на беларускую сялянскую масу і... польшчыць яе!

Але гэтым мяркаваньням ня суджана было зьдзейсьніцца! Аб маральнай і гаспадарчай вартасьці пераважнае часьці асадніцкага элемэнту нам гаварыць ня прыходзіцца: належную ацэнку яму дала ўжо даўно ўся польская прэса, асабліва-ж востры прысуд асаднікам далі... польскія-ж абшарнікі (гл. аб гэтым рад стацей у віленскім „Słowe“!), якія заяўляюць, што палітыка асадніцтва толькі папсавала і без таго благія адносіны між польскім дваром і беларускай вёскай...

Незалежна ад гэтага, палажэньне на так-званых „Усходніх Крэсах“ за апошнія часы прыняло для польскага элемэнту тутака дужа небясьпечны характар. Напады звычайных бандытаў і так-званых „дывэрсыйных банд“ на польскія двары і польскіх асаднікаў сталіся штодзенным зьявішчам. І далейшае выпаўненьне некалі такой прыемнай „цывілізацыйнай“ місіі польскіх „культуртрэгераў“ зрабілася ўжо ня толькі цяжкім і няпрыемным, але і прост небясьпечным. Асабліва-ж—ня гледзячы на масу раскватараванага на „Крэсах“ войска і паліцыі—даецца ў знакі блізкасьць радавае граніцы...

„Палітыка моцнае рукі“ абяцуе палажыць канец усім гэным трывогам і небясьпекам. З гэтай мэтай праектуецца рад нават такіх жорсткіх мераў, як увядзеньне „кругавое парукі“—адказнасьці ўсяго насяленьня вёсак беларускіх за кожын бандыцкі ці дывэрсыйны напад у межах вёскі ці ў ваколіцах яе.

Але такая палітыка, незалежна ад вельмі благога ўражаньня, якое яна зробіць заграніцай, мае ў сабе і яшчэ адну хібу, пры сучасным стане польскага скарбу асабліва няпрыемную для Польшчы: яна вельмі дорага каштуе! Запраўды: давай абшарнікам розныя палёгкі ў падатках і крэдыты—дзеля выпаўненьня імі іх „цывілізацыйнае місіі“, выдавай без канца дапамогі асаднікам, дый да ўсяго гэтага ўтрымлівай дзесяткі тысячаў паліцэйскіх і жаўнераў, каб забясьпечыць ім жыцьцё і маемасьць...

Як відаць, сярод кіраўнікоў сучаснага польскага ўраду аказаліся людзі, якія, палічыўшы з алаўком у руках кошты польскага „Kulturkampfu“ на беларускіх і украінскіх землях, перакананіся, што Польшча ня ў сілах запоўніць грашмі гэную бяздонную прорву. І вось,—як піша віленскі орган „Piast“, — ўрад п. Грабскага выпрацаваў праект зямельнае рэформы для „Усходніх Крэсаў“, паводле якога праектуецца *на ўсходняй граніцы з СССР паласе, шырынёй на 70 кілямэтраў, усе дворныя землі падзяліць паміж тутэйшымі сялянамі.* Гэтак, паводле думкі аўтараў праекту, *польскасьць на „Крэсах“ адсунецца на захад,* і ўсе ўдары з усходу будуць гэтак падаць ня ў тутэйшых палякоў, а ў беларускіх ды ўкраінскіх сялян, западозраных у спогадзе і дапамозе дывэрсыйным бандам...

Зусім зразумелая рэч, што гэты праект выклікаў праўдзівую буру сярод польскіх нацыяналістаў рознага гатунку. І хоць праект гэты хоча нашае сялянства абярнуць у *абаронны вал,* за якім польскія абшарнікі і польскія асаднікі маглі-бы ўжо зусім спакойна і бяз страху выпаўняць сваю „культурную місію“, можна было-б яго вітаць, як *першы крок у кірунку здаваленьня нашага справядлівага дамаганьня зямлі,* калі-б была надзея, што ён будзе запраўды зьдзейсьнены. Але і незалежна ад гэтага нельга моўчкі прайсьці міма гэтага праекту: гэта-ж зусім шчырае і бясспрэчнае *прызнаньне банкруцтва палянізатарскае палітыкі* на нашых „Крэсах“, гэта—першы крок у адыходзе польскасьці ў кірунку натуральных, этнаграфічных межаў Польшчы!

Гэтага прызнаньня не пераменіць ужо і эвэнтуальны правал праекту ўраду п. Грабскага.

Канфлікт паміж Польшчай і Гданскам.

Паміж Польшчай і Гданскім сэнатам выбухнуў вельмі востры канфлікт, які можа скончыцца зусім неаблічанымі вынікамі.

Аднэй пекнай раніцай усе толькі-што павешаныя на вуліцах польскія паштовыя скрынкі ў месьце Гданску аказаліся перамаляванымі ў гданскія (ці нямецкія?) дзяржаўныя калеры, або зусім зьнішчанымі. Адначасна ў цэлым радзе данцыгскіх газэтаў зьявіліся „правакатацыйныя“ артыкулы, заклікаючыя—што найменш — да непашаны да польскай дзяржавы і польскай улады ў Данцыгу. Польскі Гданск ускіпеў абурэньнем. Паўнамоцны міністар Польшчы ў Гданску, п. Страсбургер заявіў у вельмі рашучай ноце да Сэнату рэзкі пратэст.

У патрыятычнай польскай прэсе ўжо пачаліся ваенныя „бубны і літаўры“: чакаюць толькі, што адкажа зрабіць гданскі Сэнат.

І вось сэнат Вольнага Места Данцыга прыслаў адказ на грозную ноту польскага міністра.

Сэнат піша, што папросту не прызнае за Польшчай права мець у Данцыгу свае асобныя паштовыя скрынкі, што для гэтага ёсьць агульна-дзяржаўная пошта ў Вольным Месьце. Што папсаваньне ці перамаляваньне скрынак—што найбольш — парушэньне прыватнай уласнасьці. А што датычыць антыпольскіх артыкулаў у данцыгскіх газэтах, дык праступнага ў іх нічога Сэнат ня бачыць, бо-ж перад усім тут ня Польшча, а другое, што ў Вольным Месьце ёсьць і вольнасьць прэсы.

Адказ гэты страшэнна абурыў генаральнага камісара п. Страсбургера, які зараз-жа выслаў да Сэнату другую ноту, у якой яшчэ мацней трэбуе — каб урад пакараў віноўных і каб сэнат Вольнага Места прыйшоў да яго з павіннай галавой і прынёс яму, генаральнаму камісару Польскага Ўраду, свае перапросіны—у гмаху генаральнага камісарыяту.

Можна быць пэўным, што сэнат гэтага ня зробіць. Дык—што-ж далей?..

На фальшывай вышыні.

(Новая міжнародная Канфэрэнцыя ў Парыжу).

6 студня адчынілася ў Парыжу новая міжсаюзная канфэрэнцыя.

Канфэрэнцыя мае на афіцыяльнай павестцы дня падзел паміж саюзьнікамі тых адшкадаваўчых сумаў, якія спагнаны з нямецкага народу — на падставе так званага „пляну Доўса“. У Канфэрэнцыі дзеля таго прымаюць учасьце міністры фінансаў Англіі, Францыі, Італіі, Японіі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Польшчы, Румыніі, Грэцыі і Партугаліі. Ёсьць і прадстаўнік Амэрыкі—на „асаблівым палажэньні“, як на ўсіх эўрапэйскіх канфэрэнцыях.

Але гэтая афіцыяльная павестка Канфэрэнцыі—толькі вывеска, якая павешана дзеля таго, каб у Канфэрэнцыі прыняла ўчасьце Амэрыка... У запраўднасьці галоўнай задачай (—хаця ніхто ня мае веры, што яна будзе вырашана на гэтай Канфэрэнцыі)—зьяўляецца вельмі зложная і цяжкая справа ўрэгуляваньня ўзаемных даўгоў паміж саюзьнікамі, а перад усім — эўрапэйскіх даўгоў Амэрыцы і даўгоў кантынэнту—Англіі.

Якая велічыня гэтых даўгоў Эўропы—Амэрыцы за помач апошняе ў часе вайны, відаць з таго, што адна толькі Англія пазычыла ў Амэрыкі 5 мільярдаў даляраў, Францыя—каля 3 мільярдаў; а Англіі вінаваты супольныя эўрапэйскія дзяржавы, перад усім Францыя,— каля 10 мільярдаў даляраў...

Праз усе гэтыя годы пасьля вайны ўся Эўропа моцна верыла, што багатая і вялікадушная Амэрыка „даруець“ згалеўшай Эўропе яе ваенныя даўгі, і дзеля таго . бадай-што ніводная дзяржава нічога не плаціла Амэрыцы, а за адно ўжо і Англіі,—бо, спадзяючыся скасаваньня ангійскага доўгу Амэрыцы, ня было сэнсу плаціць свайго доўгу Англіі.

Калі-ж пачало выясьняцца, што Амэрыка даўгоў „дараваць“ ня зьбіраецца, а—наадварот—пачала націскаць усе мацней на эўрапэйскіх даўжнікоў, перад усім — на Англію, як на галоўнага даўжніка і галоўнага жыранта (паручыцеля) ўсіх іншых дзяржаў, тады Англія пачала плаціць Амэрыцы, але адны толькі працэнты, тлумачучыся тым, што ёй самой яе даўжнікі ня плоцяць нават і процантаў...

Сьпярша здавалася, што справа вырашаецца вельмі лёгка,—бо за ўсё і за ўсіх хацелі змусіць плаціць пераможаную Нямеччыну.

Але аказалася, што Нямеччына хоча плаціць ня гэтулькі, колькі хочуць спагнаць з яе яе пэ-

раможцы, а—гэтулькі, колькі яна ў сілах заплаціць, ня руйнуючы свайго гаспадарчага жыцьця, і ня страціўшы эканамічнай раўнавагі, без якой яна не магла-б гарантаваць ніякіх адшкадаваньняў. Сьпярша Англія (Л.-Джордж), а пасьля Амэрыка падтрымалі Нямеччыну, і прышлося ўсім згадзіцца... Нават Францыі прыдзецца плаціць свае даўгі Амэрыцы!..

Але Амэрыка зусім ня хоча, каб справа ўрэгуляваньня яе пазык Эўропе разглядалася і вырашалася, як **палітычная справа**, на нейкай канфэрэнцыі, якая заўсёды і міма волі будзе мець палітычны характар, Амэрыка стаіць на грунце чыста камэрцыйным: хто ўзяў грошы, той мусіць плаціць!

І вось, дзеля таго, каб Амэрыка згадзілася прыслаць свайго прадстаўніка на Канфэрэнцыю, справа ваенных даўгоў між саюзьнікамі афіцыяльна зьнята з праграмы Канфэрэнцыі, і павестка яе абмяжована падзелам нямецкай „раты“, да чаго Амэрыка афіцыяльна заявіла і сваю пратэнзію.

Але ня можа быць сумліву, што галоўнай тэмай нарад у Парыжу будзе якраз справа ўрэгуляваньня даўгоў, аб чым выразна заявіў у ангельскім парляманце—ужо пасьля пратэсту Амэрыкі—англійскі міністар фінансаў Чэрчыль.

На колькі фатальны фінансавы стан Францыі, якая ўсё лечыць свой франк і ўсё ніяк яго вылечыць ня можа, ведама добра ўсім: дыктатура ў Эўропе і канкурэнцыя ў сусьветнай палітыцы з Англіяй і Амэрыкай каштуе вялізарных грошаў...

Дык плаціць даўгоў Францыя Амэрыцы ня хоча...

Мы добра памятаем той суровы „выгавар“, які атрымала ад Амэрыкі і змушана была зьесьці, як школьнік, Францыя за пазыкі сваім „васалам“ на ўсходзе Заходняй Эўропы...

Але тое, што здарылася (—якраз перад гэтай Парыжскай Канфэрэнцыяй!) паміж Францыяй і Амэрыкай,—яшчэ больш цікаўна.

Справа пачалася з таго, што ў тым балянсе, які прадставіў францускі міністар фінансаў Парляманту на Новы Год, ані водным словам не ўспамінаецца сплата францускіх даўгоў ані Амэрыцы, ані Англіі...

У тлумачэньнях да гэтага дзяржаўнага балянсу Францыі мін. фінансаў Клемантэло заявіў, што гэныя даўгі Францыі, праўду кажучы, зусім не даўгі Францыі, бо грошы Францыя брала на вайну з Нямеччынай, а справа гэтай вайны — справа агульная, — сусьветная. Дык і даўгі ўсіх учасьнікаў вайны — саюзьнікаў трэба злажыць у адно і падзяліць паміж імі ўсімі, паводле іх фінансавай сілы.

У Амэрыцы гэты „праект“ францускага міністра фінансаў выклікаў запраўднае абурэньне.

„Францыя ня хоча плаціць сваіх даўгоў—ані Амэрыцы, ані Англіі!“ — вось, што вычыталі амэрыканцы з афіцыяльнага дакладу міністра Клемантэля.

Ня толькі ўся амэрыканская прэса, нават вельмі прыхільная раней да Францыі, але і афіцыяльны орган самога прэзыдэнта рэзка і забойча адгукнуліся на няўдалы „праект“ п. Клемантэля.

„Францыя ня хоча плаціць сваіх даўгоў, але хоча, каб яе даўгі плацілі амэрыканскія грамадзяне, якія ўжо фактычна заплацілі за яе больш, чым 800 міліёнаў даляраў, як проценты, — за тое, што яны пазычылі ёй 3 міліярды даляраў“...—так казаў адзін з прыяцеляў Францыі, сэнатар Рыд, у амэрыканскім сэнаце 29 сьнежня, пагражаючы Францыі пазбаўленьнем яе ўсякага крэдыту ў Амэрыцы...

Але папросту забойчай зьяўляецца грозная перасьцярога ці „выгавар“ у афіцыяльным камунікаце „Белага Дому“ (Палац Прэзыдэнта) з 30 сьнежня.—У гэтым камунікаце амэрыканскі ўрад, кажучы, як найкарацей, пагражае „адным рухам пальца“ пазбавіць Францыю крэдыту ў Амэрыцы, забараніўшы даваць яго нават прыватным асобам... Але і гэтага ня было-б патрэбна, бо гэткае паступаньне Францыі (адмова плаціць даўгі) адразу абясцэніць усе францускія цэннасьці ў Амэрыцы...

Калі мы прыпомнім, што толькі-што францускі ўрад атрымаў 100-міліённую пазыку ў Амэрыцы, каб ўратаваць свой франк, дык зразумеем усю фатальнасьць гэтай пагрозы Амэрыкі пазбавіць Францыю крэдыту і абясцэніць у сябе цэннасьці (паперы).

Каб зразумець даканца вялізарнае абурэньне проці Францыі ў Амэрыцы, трэба дадаць, што „няўдачлівы“ п. Клемантэль у тым-жа сваім фінансавым дакладзе заявіў афіцыяльна ад імя ўраду, што апошні лічыць, быццам „плян Доўса“ зусім не касуе старога пляну спагону з Нямеччыны адшкадаваньняў, які быў значна выгадней для Францыі...

Трэба-ж ведаць, што Амэрыка ня толькі выпрацавала „плян Доўса“, ня толькі гарантавала Нямеччыне яго межы і спосабы зьдзейсьненьня, але і **на падставе гэтага пляну спагону адшкадаваньняў, без нарушэньня фінансава-эканамічнае раўнавагі Нямеччыны**, на які згодзіліся яе, Амэрыкі, фінансавыя экспэрты, яна толькі і дала 800 міліённую пазыку Нямеччыне. А вось — пасьля ўсяго гэтага, калі „плян Доўса“, ужо падпісаны паміж іншымі і Францыяй, ды ўжо ўведзены ў жыцьцё, калі пазыка Нямеччыне ўжо ў значнай частцы пераведзена з Амэрыкі ў Нямецкі банк, — тады міністар фінансаў Францыі заяўляе афіцыяльна, што яго ўрад мае права і будзе спаганяць з Нямеччыны, апрача таго, на што згадзіўся яго крэдытар — Амэрыка, яшчэ больш — іменна тое, што ўжо, паводле амэрыканскіх экспэртаў — можа зруйнаваць даўжніка, ды пагражае тэй пазыцы, якую, каб забясьпечыць для ўсіх адшкадаваньні, згадзілася даць Амэрыка...

Але і гэта яшчэ ня ўсё.

Вядомы фінансавы дзеяч Францыі, былы міністар яе, п. Люшэр, у гутарцы з былым амэрыканскім паслом у Лёндане заявіў, што Францыя лічыць усе свае ваенныя даўгі „ня фінансавымі, але палітычнымі“... і што наагул Францыя ня мае ніякага жаданьня калі-небудзь... плаціць гэтыя даўгі...

Тут ужо ў амэрыканскай прэсе пачаўся запраўдны „кацячы канцэрт“ у чэсьць Францыі. Тады францускі ўрад зразумеў, што справа можа зайсьці лішне ўжо далёка, і сам прэм'ер Эрыо афіцыяльна заверыў амэрыканскага пасла, што міністры папросту „брэдзяць“... Быў сьпешна выданы афіцыяльны камунікат урадавага агента аб тым, што Францыя зусім не адмаўляецца плаціць даўгі, але толькі шукае дзеля гэтага грошаў. Няўдачлівы міністар фінансаў п. Клемантэль падаў амэрыканскаму паслу абшырны мэмарыял аб тым, як ён будзе шукаць гэтых грошаў, каб заплаціць даўгі. Насьпех быў выпрацаваны цэлы „плян Клемантэля“, як сплаціць амэрыканскія „рэпарацыі“... Плян разьлічаны на працяг штось каля.. ста гадоў.

Усё гэта выглядае неяк вельмі непаважна. І як-раз уся гэтая сумная гумарыстыка толькі падчырківае і адцяняе, як рэзкі кантраст, пагрозу запраўднага фінансавага бяссільля Францыі... — Францыя ня будзе (— бо ня можа!) плаціць свае даўгі.

А з гэтага вынікае цэлы рад няўхільных вывадаў. Калі Францыя — вялікая дзяржава, калі яна хоча весьці каштоўную сусьветную палітыку імпэрыялізму, дык яна павінна плаціць Амэрыцы яе мільярды... А калі ня можа плаціць, дык, значыць, ня можа быць і ня будзе вялікай дзяржавай... Бо што-ж гэта, запраўды, за „вялікая дзяржава“, калі Амэрыка можа „адным рухам пальца“ фінансава зруйнаваць яе, пазбавіўшы крэдыту на сусьветным рынку?!

У-ва ўсей гэтай вельмі павучаючай гісторыі з міжсаюзнымі ваеннымі даўгамі, якіх так рашуча дамагаюцца дзяржавы—крэдытары і якіх так упорна ня хочуць плаціць дзяржавы—даўжнікі, найбольш цікава ня тое, аб чым у ёй гаворыцца, але тое, аб чым у ёй усе маўчаць.

Чаму, запраўды, тая самая Францыя, якая на раз—вуснамі сваіх найбольш адважных і адкрытых палітыкаў—заяўляла, што мае права не плаціць сваіх ваенных даўгоў, што пайшлі на агульную і супольную справу,—чаму тая самая Францыя, адмаўляючыся плаціць даўгі Амэрыцы і Англіі, адначасна рашуча і ўльтыматыўна трэбуе звароту пазычаных ею расейскаму ўраду мільярдаў, якія таксама былі вытрачаны на тое, каб кідаць мільёны сялян Расейскае імпэрыі пад нямецкія гарматы, ды гэтак ратаваць „ад тэўтонскага рабства“ тую самую Францыю?!...

Голая і босая сялянская Расея мае прынамся тую перавагу над Францыяй, што яна, ужо зваліўшыся на зямлю з фальшывай царскай вышыні, **стаіць крэпка** на гэтай зямлі і, не баючыся нікога, можа пазволіць сабе казаць усяму сьвету ўсю праўду—аб усім, а паміж іншым і аб „сваіх“ даўгах, казаць адкрыта, што яна **плаціць іх ня будзе і ня хоча**, бо ня можа і ня лічыць **сваімі**..— У Францыі гэткага прывілею і мужства няма. — Бо яна—яшчэ трымаецца на сваей **фальшывай вышыні**.

М.

Палітычны агляд.

У Польшчы.

Папраўкі мін. Тугутта.

Віцэ-прэм'ер Тугутт падаў радзе міністраў праект сваіх папраў да „выканаўчага распараджэньня“ міністэрства да так-званых „языковых законаў“.

Мін. Тугутт афіцыяльна сцьвярджае тое, што пісалі ў свой час беларускія і лепшыя польскія газэты аб гэтым „распараджэньні“,—якое запраўды перашкаджае ўвядзеньню гэтых законаў у жыцьцё.

Папраўкі мін. Тугутта датычаць пераважна школьніцтва, ды права зварачацца да ўлады пабеларуску такжа і небеларусам.

Але трэба адкрыта сказаць, што ад усей гэтай працы пана віцэ-прэм'ера няма чаго спадзявацца. Бо таго паўнаўладнага паўнамоцнага „міністра для Крэсаў“, якому для вялікшае вагі і павагі далі тытул заступніка ў гэтых справах усей улады самага прэм'ера, раз сам-жа ён кажа зусім ясна аб сваім бяссільлі,—можна толькі назваць выразным тэрмінам: „імпотэнт“.

П. віцэ-прэм'ер упаўнамочаны і мае ўладу рабіць толькі тое, што яму дазваляюць запраўдныя валадыры і гаспадары Польшчы—эндэкі...

Яшчэ адно „niestety“ п. віцэ-прэм'ера Тугутта.

Яшчэ некалькі дзён таму афіцыозы паведамлялі аб тым, што першай з мераў у радзе рэформ, маючых ашчасьлівіць „Крэсы“ (пасьля кругавой парукі цэлых вёсак за праступленьні адзінак, што сам рэформатар назваў уваскрашэньнем барварства...) мае, быць шырокае дараваньне правоў польскага абыватэльства „крэсоваму“ насяленьню...

Так казаў, пісаў,—хацеў, абяцаў паўнаўладны міністар п. Тугутт...

Але — „niestety“...

„8 студня“, так пішуць з Варшавы, у „Dzien. Wil.“,—пры ўчасьці (толькі! niestety!) мін. Тугутта, віцэ-міністра ўнутраных спраў Смольскага, п. Романа, п. Забежоўскага і прадстаўніка дэпартаманту паліцыі міністэрства ўнутр. спраў адбылася канфэрэнцыя ў справе ўрэгуляваньня... довадаў абыватэльства на Усходніх Землях“... Пастаноўлена, дзеля якнайхутчэйшага ўрэгуляваньня запраўды палючае і балючае справы, выдаць цыркуляр, які мае растлумачыць закон аб абыватэльстве 1920 году!..

Вось тое новае („z roku 1920“...), тое „значнае пашырэньне кадраў абыватэльства“, аб якім казаў п. Тутугтт...

Сварка „між сваімі“.

У Варшаве ўжо некалькі гадоў выходзе француская газэта „Journal de Pologne“, якая заўсёды старалася раздзьмухіваць польскі нацыяналізм і вельмі варожа выступала проці „нацыянальных меншасьцяў“. Але-ж, як піша „Gaz. Warsz.“, у апошнія дні ўзьнялася нейкая спрэчка паміж выдаўцамі францускае газэты і польскім урадам. У сувязі з гэтым у „Journal de Pologne“ надрукавана была стацьця, у якой рэдакцыя востра нападае на гасьцінны ўрад Польшы і робіць выразныя пагрозы Польшчы, напамінаючы ёй, што Францыя ўжо завязала зносіны з Радавай Расеяй...

Арышты сярод польскага студэнцтва ў Варшаве.

Гэтымі днямі зроблены обыск у кватэры старшыні польскага студэнцкага саюзу „Życie“, дзе знойдзены дакумэнты і архіў арганізацыі (?). Арыштавана, відаць, у сувязі з гэтым, яшчэ некалькі студэнтаў... („Dz. Wil.“).

Напад на фальварак.

31/XII 1924 г. ўзброеная ватага з 40 душ зрабіла напад на фальварак Бэйкаўцы ў Крэмянецкім павеце.

Патруль пагранічнай стражы адбіў напад і захапіў 2-х учасьнікаў нападу. Рэшта ўчасьнікаў укрылася ў ваколіцах Новага Ставу. Тады патрулём корпусу хутка была наладжана, супольна з паліцыяй, пагоня, якая захапіла яшчэ 7 учасьнікаў нападу з аружжам у руках—у той мамэнт, калі тыя рыхтаваліся да нападу на адзін з суседніх фальваркаў.

Адбітая банда.

7 студня дывэрсыйная банда прабавала перайсьці граніцу каля в. Баршчоўка, Роўненскага пав., але была адкінута назад атрадам польскіх пагранічнікаў.

Заграніцай.

Расейска-японска-кітайскі саюз.

Беларускія газэты пісалі ўжо аб праекце расейска-японска кітайскага саюзу.

Цяпер лёнданскія газэты наказуюць з Пэкіна, што перагаворы, якія вядуцца паміж СССР і Японіяй, маюць на мэце ня толькі прызнаньне Японіяй СССР, але і стварэньне гэнага самага саюзу Расеі, Японіі і Кітаю. Мэтай гэтага вялікага саюзу будзе супольны кантроль усей палітыкі Далёкага Ўсходу, а таксама і выключэньне стуль усіх іншых уплываў (Эўропы і Амэрыкі).

Англійскія газэты б'юць трывогу, з прычыны гэтага праекту, адзначаючы небясьпеку яго для эўрапэйскіх інтарэсаў у Азіі.

Заместа „Жэнеўскага пратаколу“.

Як ведама, уся праца п. п. Мак-Дональда, Эрыо і... Скшыньскага зьведзена „на нет“ адмовай англійскіх домініяў.

Цяпер англійская прэса, каб пацешыць Францыю, піша, што англійскі ўрад даў сваім экспэртам загад апрацаваць нешта такое, што-б замяніла жэнеўскі пратакол.

Экспэрты быццм ужо выпрацавалі цэлую сыстэму новых гарантыяў для эўрапэйскага міру, у якую ўваходзяць:

1) Абаронныя саюзы англа-фланцускі і англа-бэльгійскі.

2) Панаўленьне Англіяй гарантыі нятыкальнасьці бэльгійскай тэрыторыі.

3) Стварэньне з Кельнскага абшару з мастамі праз Рэйн разброенае тэрыторыі, нятыкальнасьць якой павінна быць гарантавана асобным дагаворам паміж Англіяй, францыяй і Бэльгіяй—з аднаго боку і Нямеччынай—з другога.

Да ўтварэньня новага ўраду ў Нямеччыне.

Пасьля таго, як выясьнілася немагчымасьць стварэньня абапёртага на права, або на лева-цэнтравай большасьці парляманцкага ўраду, канцлер Маркс атрымаў увечары 3-га студня даручэньне прэзыдэнта рэспублікі ўтварыць пазапарляманцкі, „чыноўніцкі“ габінэт. Думаюць, што ўсё-ж большасьць міністраў будзе з дэпутатаў і толькі 3—4 з урадоўцаў — спэцыялістаў.

Новы габінэт Маркса.

Урадавы крызіс у Нямеччыне як-быццам закончыўся. Канцлер Маркс у рэзультаце перагавораў з прэ-

На радавым пагранічча.

ПАТ дае гэткія інфармацыі аб здарэньнях, якія мелі месца на адрэзку польска-радавае граніцы, занятым корпусам пагранічнікаў, у працягу апошніх двух месяцаў (ад 1 лістапада да 1 студня).

Спроб дывэрсыйных банд у складзе ад 5 да 30 душ перайсьці з радавага боку на польскі было 18. У-ва ўсіх гэтых выпадках банды былі пагранічнікамі адбіты і прымушаны адыйсьці на радавую тэрыторыю.

Спроб дывэрсыйных банд, пасьля нападаў, прабіцца з аружжам у руках з польскае тэрыторыі на радавую было 14; аружных нападаў на аб'екты (?) ў районах брыгадаў пагранічнае варты — 15; выпадкаў захвату польскіх жаўнераў радавымі пагранічнікамі —6; у бітвах з дывэрсантамі спаміж польскіх пагранічнікаў забіты 2 і ранены 2, а бандытаў і цывільных асоб пагранічнікі забілі на граніцы 14, ранілі 12; злоўленых бандытаў, дывэрсантаў і шпігоў было 60. Захоплены 3 радавыя жаўнеры, якія перайшлі на польскі бок. Арыштаваны 73 падазроныя асобы за нелегальны пераход граніцы, ды 349 кантрабандыстаў.

На радавы бок выселены 51 асоба; затрыманы 37 асоб, выселеных з радавага боку.

Захопленыя тры радавыя жаўнеры заменены на трох польскіх жаўнераў і аднаго паліцыянта. Радавых дэзэртыраў перайшло на польскі бок 2 (—скольki перайшло з польскага на радавы бок, справаздача не паказуе).

зыдэнтам і правадырамі клюбаў—стварыў тымчасовы габінэт, апіраючыся (? так піша „ПАТ"...) на цэнтр і дэмакратаў і маючы падтрыманьне сацыял-демакратаў... Магчыма, што ў габінэце прымуць учасьце прадстаўнікі гаспадарчае партыі і баварскіх людоўцаў. Канцлер мае надзею, што і нямецкія людоўцы зьменяць адносіны да ўраду і вернуць сваіх прадстаўнікоў (Штрэзэмана — міністра загранічных спраў і інш.) назад у габінэт...

Пакуль што міністрам загранічных спраў будзе сам Маркс.

Напружаньне паміж Францыяй і Нямеччынай.

На грунце спыненьня перагавораў паміж немцамі і французамі аб заключэньні новага гаспадарчага дагавору расьце напружаньне паміж абыдвума ўрадамі.

Нямеччына, звольненая ад 10 студня ад прымусовай гаспадарчай „апекі" з боку саюзьнікаў, рашуча адмаўляецца спаўняць нявыгадныя для яе дамаганьні Францыі. — Так, напрыклад, нямецкі ўрад рашуча адкінуў дамаганьні Францыі скасаваць усе мытныя абмяжаваньні ў тарговых зносінах Эльзасу і Лётарынгіі з Нямеччынай, чаго трэбуе французскі ўрад.

Запраўды-ж дзіўна: ня трэба было палітычна аддзяляць ад Нямеччыны гэтыя правінцыі і ваяваць дзеля гэтага, калі яны гаспадарча цягнуць да Нямеччыны...

Работнікі проці акупацыі Кельну.

Работніцкія арганізацыі акупаваных абшараў Нямеччыны выдалі адозву, у якой рэзка пратэстуюць проці прадаўжэньня акупацыі Кельнскага раёну.

Адозва падчырківае, што работніцкія саюзы заўсёды стаялі на грунце сумленнага выкананьня Нямеччынай Вэрсальскага Трактату, дык гэта дае ім асаблівае права цяпер трэбаваць гэткага-ж выкананьня і саюзьнікамі.

Адклад узнаўленьня сэсіі італьянскага парляманту.

Па прапазіцыі Мусоліні „парлямант" адлажыў сваі паседжаньні на 6 месяцаў.

Цяпер Мусоліні заяўляе, што ён, можа, скліча „парлямант" шмат раней, калі ўрад падрыхтуе новы выбарны закон і іншыя законапраекты.

Новы выбарны закон і новыя выбары ў Італіі.

Мусоліні аканчальна рашыў гвалтам правясьці праз „парлямант" свой новы выбарны закон, які будзе прыняты яшчэ ў студні. А праз вымаганыя канстытуцыяй ня менш, як 45 дзён, гэта значыць: у палове сакавіка,—могуць ужо адбыцца новыя выбары.

Маніфэст апазіцыі да народу.

Апазіцыя выпрацоўвае плян барацьбя з Мусоліні і новай спробай тэрору. Паміж іншым, мае быць выдана вялікая адозва да італьянскага народу.

Узнаўленьне фашыстаўскага тэрору.

Абяцанае Мусоліні „высьвятленьне палажэньня" ў Італіі запраўды „высьвятляецца". Пачаліся гвалтоўныя вобыскі і арышты сярод выдатнейшых дзеячоў апазіцыі. Арышты робіць фашыстаўская міліцыя. Паліцыя атрымала загад ад Мусоліні выпаўняць усе даручэньні міліцыі. Разгромы апазіцыйных газэт прадаўжаюцца. У Вэнэцыі, Каррары, Фэррары зруйнаваны кватэры рэдакцыяў. Калі пакрыўджаныя клічуць паліцыю, дык паліцыя, згодна з загадам Мусоліні, па трэбаваньню фашыстаў арыштоўвае працаўнікоў рэдакцыяў.

Фашыстаўскія прэфэкты (старосты) аб'яўляюць у сябе „малое асаднае палажэньне" і пазбаўляюць усялякіх гарантыяў насяленьне.

Англійскія газэты пішуць, што гэткім тэрорам Мусоліні хоча справакаваць хатнюю вайну ў Італіі.

Да усіх пэдагогау.

(*Голас беларускага настаўніка*).

Добра вядома, што, калі хочаш стацца вучыцелем і вучыць дзяцей, дык трэба ўпярод самому навучыцца.

Доўга даўней прыходзілася вучыцца, каб быць самому правадніком сьвятла і ліквідатарам няпісьменнасьці. Вельмі шмат часу прыходзілася марнаваць і на што зусім непатрэбнае, але трэба зазначыць, што і добрага здабывалася вучэньнем ня мала. Асаблівую ўвагу заўсёды зварачалі кіраўнікі настаўніцкіх школаў, каб будучыя настаўнікі добра пазнаёміліся з вялікімі думкамі найвялікшых сусьветных пэдагогаў, як Жан Жак Русо, Пэсталоцці, Таўстой і шмат іншых.

Пэдагогіка, як і мэдыцына, аграномія, ці тэхніка, выпрацоўвалася вякамі. Вялікі пэдагогнастаўнік аднаго краю быў добра вядомы і ў другім краю. Яго творы, яго думкі, як маланка, аблятали ўвесь культурны сьвет. Да яго прыслухаліся, навуку яго выкладалі, ім гардзіліся, на яго словы апіраліся, яго думкаю даказвалі, яго творамі і працай карысталіся ўзгадавальнікі настаўнікаў дзеля таго, каб знайсьці самую лёгкую дарогу дзеля змаганьня з цемрай народу, бяспісьменнасьцю.

Цяжкая гэта праца--зьвясьці няпісьменнасьць, усероўна, як даўней—было цяжка ваяваць з воспаю: але, калі знайшлі дахтары сыраватку, дык цяпер гэная хвароба зусім ня страшна, бо навуку гэную зразумеў ня толькі доктар, але і фэльшар.

Як змагацца з воспаю—вядома ўсяму культурнаму і някультурнаму сьвету. А як найлягчэй зьвясьці няпісьменнасьць,—мне здаецца, што гэдак сама павінны ведаць не ано вучыцялі польскіх школ, але нат' і п. п. інспэктары, куратары, міністры асьветы, дый, здаецца, аб гэтым павінны выкладаць на лекцыях у ўрадавых прэпарандах і сэмінарыях вучыцельскіх.

Кожны з пэдагогаў ці кандыдат у пэдагогі павінен узяцца за працу ажно пасьля таго, як сам зразумеець, што дзіця найляпей зразумеець чужога чалавека, калі гэны чужы чалавек загаворыць да дзіцяці тэй мовай, якой дзіця гавора з сваёю роднаю маткаю. Калі-ж увайсьці ў хату і загаварыць да сямігадовага дзіцяці чужою, незразумелаю моваю, дык дзіця раскрыець роцік, станець каля маткі, улепіцца ручкаю за яе андарак, вытрапічыць вочкі і пачне пазіраць то на матку, то на чужога чалавека, думаючы, што чужы будзець штось гаварыць з маткаю. А калі і маці нічога не разумеець мовы чужога, дык дзіця да таго пужаецца, што робіцца бляды і, маўчкі пазіраючы ваўком, жджэ, каб чужы хутчэй выйшаў з хаты.

Высылаючы дзіця з хаты вучыцца да школы, дзе дзіця ніводнага слова не пачуець адразу ў роднай матчынай мове, бацькі ўсёроўна, што душаць гэнае дзіця сваімі ўласнымі рукамі. Пэдагог, які бярэцца адразу—„па-своему" — у чужой мове вучыць дзіця, не адзываючыся да дзіцяці хаця-бы ў першы і другі год навукі ў роднай мове дзіцяці, ня маець права быць і насіць назову пэдагога, што-дня, крок за крокам, забіваець душу, сэрца, волю, нацыянальнае пачуцьцё і думку дзіцяці--ахвяры.

Вучыцялі, якія па беларускіх вёсках разьмешчаны ў польскіх школах, каб адразу „адвучыць" дзіця ад „мужыцкае" мовы і навучыць яго мовы панскай, часта ўжываюць дзеля гэтага навет мэтад біцьця і зьдзекаў над дзяцьмі беларусамі. Гэткія людзі ня маюць маральнага права называцца пэдагогамі, і польскае-ж вучыцельства павінна само з імі змагацца, каб не заражалі гнільлю ўсяе іхняе-ж вучыцельскае сям'і!

Вядома, што хоць і цёмны мужык беларус, аднак праз тры гады практыкі навучыўся, што дзіця яго ня толькі не навучылася чытаць і пісаць папольску, але нат' забылася, хто яно і хто яго бацька і маці, чаму яны гавораць не „папанску", а „па-мужыцку", чаму пан ніц ня можа гаварыць памужыцку. І бачаць бацькі, што дзіця скалечанае, што з яго зроблена ні тое, ні сёе — ні пан, ні мужык; а гэта-ж найгарэй, калі чалавек ня ведаець, хто ён.

Заварушыўся беларус, аглянуўшыся наўкола, і зажадаў свайго. Сабраўся, ухваліў, напісаў, адаслаў і жджэць. Устрымаў дзяцей ад польскай школы і жджэць месяц, другі, трэці... Нічога ня чутно, ані гу-гу. Праз які тыдзень навінка: пан павятовы школьны інспэктар—правадыр вясковых польскіх пэдагогаў—гасьцінчык шлець вёсцы—па пяць дзён арышту павінны адбыць бацькі-**беларусы** за тое, што іх дзеці ня ходзяць да **польскай** школы. Зноў зьбегліся, парадзіліся цёмныя мужыкі-беларусы, ды згаварыліся: каб дзеткі іх не марнавалі часу, дык хоць і плаціць вялізарныя падаткі, адчыніць на свой кошт сваю родную беларускую прыватную школу. Пачалася праца—загаманілі. Праз тыдзень паліцыянты па загаду павятовага інспэктара шукаюць „злачынцу" „бальшавіка", зачыншчыка. Ды яшчэ навінка: яшчэ па 15 злотых ад бацькі, або па 5 дзён арышту бацькомбеларусам назначае інспэктар за тое, што яны вучаць граматы ў прыватнай школцы ў сваей роднай матчынай мове сваіх маленькіх дзетак!!!

Пэдагогі ўсяго сьвету! Скажэце, ці могуць дзеяцца ў культурным сьвеце гэткія рэчы?

Хто лічыць сябе пэдагогам, адгукніся!

Трылісьцьнік.

16. XII. 1924.

Рэпрэсіі ў Італіі.

У Нэаполі і інш. местах зроблена за апошнія дні больш 300 арыштаў. У Пэросьсі камуніст забіў фашыста.

Новы ўрад у Албаніі.

Новы валадар Албаніі, абшарнік-магамэтанін Ахмэт-бэй-Зогу, стварыў новы габінэт і на 15 студня склікае нацыянальнае сабраньне.

Аб чым пішуць.

Новагодні падрахунак.

Беларуская часопіс „Krynica" робіць гэткі агляд беларускага жыцьця ў мінулым годзе:

> Беларускі народ, робячы падрахунак сваіх здабычаў за мінулы год, многае мусіць упісаць, як прыбытак, у сваю народную скарбніцу.
>
> Беларускі народ пад камуністамі на Усходзе Беларусі, ня гледзячы на залежнасьць ад Масквы і маскалёў, ня гледзячы на ўціск сумленьня,—за мінулы год здабыў там нямала. Беларускі народ на ўсходзе сваей Бацькаўшчыны за мінулы год стойка змагаўся за родную школу і зямлю. Праўда, барацьба гэта была нялёгкая і няроўная, дык і вынікі яе ня роўныя.
>
> Але ўсё-ж ёсьць вынікі. Ёсьць ужо там многа беларускіх школ, а мова беларуская лічыцца ўрадавай і хоць у дужа малой меры, але ў жыцьцё ўводзіцца.
>
> Зямлю, якую камуністы жадалі адняць з прыватнага—вучасткавага валаданьня беларускага селяніна і перадаць у валаданьне супольнае, сябрышнае, за мінулы год тыя-ж камуністы, відзячы стойкую волю сялян, прызналі за сялянамі блізу што на ўласнасьць
>
> Беларусы пад Латвіяй, дзе спачатку не найгорш разьвівалі сваю народную думку, у мінулым годзе сваю дзейнасьць былі змушаны прыпыніць.
>
> Урад Латвійскі, бачачы буйны ўзрост Беларусаў у сваім гаспадарстве, перапалохаўся і добрыя адносіны да беларусаў зьмяніў на нягодныя. Беларуская прасьвета ў Латвіі ў мінулым годзе разьвівалася дужа слаба, а беларускія прасьветныя працаўнікі, як І. Краскоўскі, Якубецкі, Езавітаў і інш. пасаджаны ў турмы, дзе некаторыя з іх сядзяць і да сяньня. Аднак і гэта Беларускі народ за прошлы год мусіць запісаць, як здабытак, бо, відаць, у Латвіі беларусы становяць сілу, якой урад прымушаны баяцца.
>
> Беларусы пад Польшчай ад ураду не здабылі нічога: ні школы, ні зямлі. Аднак у свой народны скарб беларусы тут за мінулы год улажылі нямала. Вось беларускія паслы, як народныя прадстаўнікі ў польскім Сойме, ад імя свайго народу стойка дабіваючыся правоў для яго, адваявалі так-званыя „ustawe językowe", каторыя, хоць самі па сабе даюць беларускаму народу дужа мала і каторыя польскім урадам ня ўведзены ў жыцьцё, маюць вялікае значэньне, бо зьяўляюцца доказам, што жыве Народ Беларускі і што трэба з ім рахавацца.
>
> Тыя-ж народныя прадстаўнікі, беларускія паслы, баронячы і дамагаючыся правоў для свайго народу ў іншых галінах сваімі мовамі ў Сойме і на мітынгах разьясьнілі народу многае, чаго іншым спосабам разьясьніць не ўдалося-б. Вось-жа, дзякуючы пераважна дзейнасьці пасольскай, мінулы год для беларусаў у Польшчы трэба адзначыць, як год яшчэ дагэтуль нябывалай сьведамасьці народнай, палітычнай і сялянскай клясавай. А сьведамасьць гэта ня менш абымае беларусаў каталікоў, як і праваслаўных.
>
> І так, мінулы год, гэта — год нябывалага ўзросту адраджэньня Беларускага Народу. А трэба ведаць, што год гэты быў ліхі для нас, год гэты, гэта—паскрэбак паваенных часоў.
>
> Будзем-жа спадзявацца, што Год Новы будзе памысьнейшы для нас і прынясе нам неспадзяваныя здабыткі.

Каб-жа гэтае пажаданьне збылося! Дадамо толькі, што мы самі павінны нашу долю каваць, крэпка верыць у свае ўласныя сілы, і—будучына будзе наша!

ХРОНІКА.

Спыненьне спагону штрафаў за школьнікаў. У адказ на тэлеграму дэпутата Ярэміча да міністра Тугутта ў справе штрафаў на бацькоў беларускіх школьнікаў, якія вучацца ў прыватных беларускіх школах і адмовіліся хадзіць у польскую ўрадовую школу ў Слонімскім павеце,—наш паважаны дэпутат атрымаў 7 студня .с. г. ад мін. Тугутта тэлеграфны адказ гэткага зьместу:

„*Міністэрства тэлеграфна загадала спыніць спаганяньне штрафаў*“.

(—) *Тугутт.*

У Бел. Навуковага Т-ве. У гэту нядзелю, 11 студзеня, у 10 гадз. раніцы адбудзецца паседжаньне ўраду Бел. Навук. Т-ва, пасьвячонае справе арганізацыі сьвяткаваньня скарынскага юбілею (400-леьцця закладзінаў першае — беларускае — друкарні ў Вільні ў 1525 годзе).

Падзяка. Урад Беларускага Навуковага Т ва шле сваю шчырую падзяку дэпутату М. Кахановічу за ахвяраваныя музэю ім. Ів. Луцкевіча старыя дакумэнты і кніжкі.

„Пагрозы камуністычнае партыі Заходняе Беларусі“. Віленскае „Słowo“ надрукавала ў № 6 з 9 студня с. г. заметку пад гэткім загалоўкам, у якой чытаем дасłоўна чароднае:

„У апошнім нумары менскае „Звезды“ чытаем: „У сувязі з заявай віцэ-міністра Тугутта аб закончаньні тайнай (?) нарады зямляўласьнікаў, польскі ўрад маніцца ўвясьці на Усходніх Крэсах кругавую адказнасьць сялян за напады. Цэнтральны камітэт камуністычнае партыі Заходняе Беларусі з гэтае прычыны заявіў, што, калі польскі ўрад пазволіць сабе (посмеет) зьдзейсьніць гэтую пастанову і пачне забіваць сялян, паліць іх дабро, дык уся камуністычная партыя, як адзін чалавек, будзе прымушана выступіць у абароне сялян. Тады за ўсе зьдзекі („bestjalstwa“) паліцыі кругавую адказнасьць панясуць зямляўласьнікі, польскія ксяндзы, урадоўцы. Усе яны, незалежна ад асабістых рысаў характару, будуць адказваць за забітых і спаленых беларускіх сялян“.

Новы беларускі палітычны працэс. 23.I.1925 г. мае адбыцца ў Віленскім Акружным Судзе разгляд справы вучняў Віленскае Белар. Гімназіі і др., якія былі заарыштаваны ў 1923 годзе. Абвінавачываюцца яны нібы ў утварэньні арганізацыі, маючай на мэце адарваньне Заходняе Беларусі ад Польшчы. Абвінавачваюцца: 1) Гардзей Васіль сын Апанаса; 2) Гардзей Васіль сын Янкі; 3) Сярэбранікаў Арсень; 4) Скабей Валадзімер: 5) Каралёнак; 6) Семашкевіч Янка; 7) Армянкевіч Балеслаў; 8) Нарушэвіч Мікалай; 9) Чарняўскі Аляксандр і 10) Мікалай Сарока. Абаронцам выступае віленскі адвакат Тадэвуш Врублеўскі.

Напады на паліцыянтаў. 6 студня каля станцыі Парубанак 3 бандыты напалі на паліцыянта Любянца, якому разьбілі каменем галаву і ўцяклі.

7 студня ў Новай Вялейцы быў напад на паліцыянта Думоўскага, якому зроблены дзьве раны ў галаву. Праступнікі скрыліся.

Напад бандытаў. 5 студня каля вёскі Засульле, Стаўпецкага павету, 5 бандытаў напалі на фурмана памешчыка Чэслава Крупскага (Крупскі, — адзін з былых памоцнікаў генаральнага камісара Асмалоўскага), жадаючы адабраць ад яго пару каней; але фурман пагнаў каней і ўцёк.

Карэспандэнцыі.

„Крыжовы шлях“.

(*З Дзісьненшчыны*).

17.XI 1924 г. Віленскі Акружны Суд на выязной сэсіі ў Глыбокім разглядаў справу жыхаркі м. Дзісны, Надзеі Нікіфароўскай, абвінавачанай у тым, што, будучы **абыватэлькай польскай у 1920 г.**, паступіла на службу ў палітадзел і палітбюрю пры савецкай арміі і сваімі паступкамі памагала няпрыяцелю ў яго дзейнасьці проці Польшчы. Па стацьці 108, § 1 К. К. Надзея Нікіфароўская засуджана на шэсьць гадоў „ciężkiego więzienia“.

Цікава прасачыць ход справы і тое, што выцерпела Н. Н. да мамэнту прыгавору.

У жыхароў фальв. Копаравічы, Язенск. гм., Дзісьненск. пав., Гілярага і Антона Лабуцёў, па сьмерці іхняга бацькі, які заставіў па сабе 150 дз. зямлі, пачалася ад 1916 г. спрэчка з сястрой Мар'яй Нікіфароўскай, якая дамагалася сваей часткі. Каб як выжыць Мар'ю Н з дачкамі Надзеяй і Верай з Копаравічаў,— Лабуці, карыстаючы з перамены улады, перанясьлі гэтую спрэчку на грунт палітычны.

Калі ў 1919 г. адступілі палякі, — дык Лабуці данасілі бальшавікам, што Н. і В. Н—скія стралялі ў савецкае войска з польскіх акопаў. Дзяўчат арыштавалі, цягалі па допросах, але адпусьцілі. У 1920 г. ў траўні Лабуці ізноў даносяць савецкай уладзе, што Н. і В. Н—скія займаліся рэквізыцыямі разам з польскімі афіцэрамі. Іх ізноў цягнуць у трыбунал, але хутка звальняюць. Тады Лабуці з „кумпанамі“ пішуць прыгавор нібы ад цэлага вобчэства — каб сям'ю Нікіфароўскіх выселілі ў Расею, як контр-рэвалюцыяністаў. Каб папярэдзіць як-небудзь бяду, Надзея Н. паступіла тады на службу ў палітаддзел. У незабаве Гіляры і Антон Лабуці былі арыштаваны як праціўнікі савецкай улады і за тое, што ў 1919 г. хавалі ў сябе Язенскага пана Сокалава і дапамаглі яму ўцячы да палякаў. Ад таго часу аб Лабуцёх нічога ня чуваць і ніхто іх нігдзе ня відзеў.

У кастрычніку 1920 г., калі ізноў прыйшлі палякі, Мялеці Лабуць і кумпанія даносяць ім, што Надзея Н. служыла ў савецкай установе. Н. Н. арыштовываюць, цягнуць у Маладэчна, трымаюць там месяць—і адпускаюць. Тады Лабуці і К° зьбіраюць падпісы, што Мар'я Н—ская з дочкамі — камуністыя. Надзею Н. арыштовываюць жандары 7-га уланскага палку, цягнуць у Глыбокае, гдзе яе судзіць суд 4-ай коннай брыгады і інтэрнуець ажно ў Кракаў, адкуль Н. Н. звальняюць у ліпні 1921 г. — Мар'ю і Веру Н. у лютым 1921 г. арыштовывае Дзісьненская дэфэнзыва і высылае іх у Беласток, адкуль яны вяртаюцца ў ліпні 1921 года і асядаюць у Дзісьне пры мужу і бацьку Яну Нікіфароўскім.

Здавалася-б, што змучанай, даведзенай да нэндзы — арыштамі і кіданьнем па цэлай Польшчы сям'і можна было чакаць спакою і адпачынку. Але 22 кастрычніка 1922 г., напярэдадні выбараў да Сойму, усіх Н. арыштаваў вядомы Дзісенцам і шмат каму вывядоўца Улінскі і трымаў іх на Дзісьн. пастарунку 12 дзён. У гэты перыяд Улінскі два разы „здымаў“ допрос з Надзеі Н. і абодва разы страшэнна яе біў; за другім разам датуль, ажно ў Н. Н. пайшла кроў з вуснаў. Бацькі пратэставалі, заяўлялі каманданту пастарунку, каб паклікаў доктара, але з гэтага нічога ня выйшла. Чародным паліц. пры абодвых катаваньнях быў паліц. Лах. Пратрымаўшы сям'ю Н. на пастарунку 12 дзён, Улінскі хворага (толькі што па апэрацыі) Яна Н. звольніў, а Марью, Надзею і Веру Н. адправіў у Вільню ў „5 F“. З Вільні Марью Н. звольнілі праз тры дні, Веру Н. праз два тыдні, а Надзею Н. пасадзілі на Лукішкі, гдзе яна сядзела да канца жніўня 1923 г., калі ей дaручылі акт абвінавачаньня і да суду адпусьцілі. Надзея Н., пры поўнай магчымасьці ўцячы заграніцу, спакойна чакала рашэньня сваей долі — чаго і дачакалася, як сьнегу на галаву.

Цікава — як гэта Н. Н. ужо (як кажа прыгавар) ў 1920 г. рахавалася „абыватэлькай Польшчы“, калі яшчэ тады нічога ня было ведама аб граніцах польскай дзяржавы. і кожны дзеля куска хлеба служыў і ў савецкіх установах, — аж да падпісаньня Рыжскага трактату. Н. Н. пакаралі як „абыватэльку польскую“, а „довàду асабістага“ ня далі і рэгістравалі яе, як чужаземку.

Ніхто са сьведкаў абвінавачаньня нічога ня мог паказаць важкага, — усе толькі відзелі пейкія паперы, чулі ад другіх — а ні воднага факту ці прадмету і ня было.

Усе сьведкі абароны паказалі зусім праціўнае.

Цікава паказаньне (на пісьме) сьведкі абвін. вывядоўцы Нароўскага, які на суд не зьявіўся. У паказаньні ён кажа, што ў 1921 г. відзеў у Полацку ў палітбюро Надзею Н., і яна яго там біла нагайкай; а жых. Дзісны I. Савіч, у якой сям'я Н. мела кватэру, — кажа, што Н. Н. у 1921 г. нікуды не выяжджала.

Хворая на сардэчныя прыпадкі і малакроўе, Н. Н. ня вынясе і году вастрогу.

Зязюля.

Усячына.

Зьмена польскага правапісу ў Меншчыне.

На старонках менскай польскай газэты „Młot“ вядзецца гарачая дыскусія аб тым, каб таксама ўпрасьціць польскі правапіс, як гэта бальшавікамі зроблена з расейскім. Мае быць выкінута ўсё лішняе, як напр. ó, rz, і інш.

У аднэй з адозваў слуцкі школьны інспэктар піша:

„Таварышы вучыцялі і інспэктары! выскажацеся голасна за сьпешную рэформу ў правапісе — у чыста бальшавіцкім духу! Ня будзем мучыць сябе і дзяцей ідыёцкімі правіламі правапісу“ і г. д.

У польскай прэсе Польшчы гэтыя заклікі выклікаюць вялікую трывогу.

Паштовая скрынка.

Райчаніну і Рэшчыку—атрымалі, скарыстаем.

Падпісчыку № 716: Вашу карэспан. зьмясьціць баімося.

Няп'ючаму: Вашы карэспандэнцыі да друку не надаюцца. Пішыце аб павэжнейшых справах.

Ад Базыля Саўчынскага, Мікалая Дарашкевіча, С. М. Пагуды, Аляксандра Цьвікевіча, Ганны Гарабурдоўны, А. Зянюка, Уладзімера Якімеца, Аляксандра Голуба, Кірыла Міхалевіча, Язэпа Саўтыча, Мікалая Тарасіка, М. Якімовіча, Аляксандра Багіны, Аляксандра Гірыса, Казімера Жэрко, Пятра Мышкі, Ксэнафонта Вайцехоўскага, Язэпа Сахарчука, Уладзімера Калядова, Сымона Мацюкевіча, Аўгена Пронко, М. Хаванскага, кс. А. Роўша, Міхала Мікуліча, Сьцяпана Барысэвіча, Яна Карповіча, Тодара Дундова, Ф. Гордона, Лазарава, К. Лабунькі, Мак. Марцінкевіча, Яна Кміты, Міхала Казэло, Язэпа Рудака, Краўца, В. Кузьміча, С. Мазурэка, Якіма Петраша, Тодара Германюка, Цыпрыяна Макуцэвіча, Міхала Баўкалава, Мікалая Пракапені, Рыгора Волчыка, Антона Казушчыка, Сымона Жыткевіча, Язэпа Будрыка, Андрэя Казачука, А. Малойла, Пятра Тымашэвіча, З. Норык, Тамаша Пэхвіцэвіча, В. Саўчынскага, Аркадзя Рэдзько, Мікалая Пратасэвіча, Сабыніча—атрымана **па 2 злоты.**

За час перарыву атрымана: Ад Якуба Лісюка, Язэпа Шухно, С. Татарына, Язэпа Странкоўскага, Алёны Кананові, Міхала Скока, Яна Дарошкевіча, Ігната Урбановіча, М. Плосскага, Язэпа Рагача, Міхала Бабілы, Васілісы Камар, Рыгора Русецкага, Яна Кендыша, Пятра Яроцэвіча—**па 4 злоты.**

Ад Яна Цыунеля, Роўбы, Сьцяпана Таранкі, Ануфра Стасевіча, С. Пабудзея **па 3 злоты.**

Ад Сінкевіча—3 зл. 20 гр. Ад Пракопа Івашкі— 3 зл. 50 гр. Ад Яна Зноркі, Д. Дожына, Н. Кушэля— **па 5 злоты.**

Ад Яна Пукелло, Канстанта Гутыча, Вінцэнта Жэмойдзіка, Ц. Раманцава, Аляксея Іванава, Сымона Пекарскага, Крынчыка, Уладзімера Шыманскага, Рыгора Ярацкага, Пятра Альшэўскага—**па 6 злоты.**

Ад Антона Парфенчыка, Пятра Бельскага, Рыгора Шчэнько—**па 7 злоты.**—Ад Ніканора Карабейніка і Міхала Макарэвіча — **па 8 злоты.** Ад Сымона Палудзеня, П. Кобака, Наваграна — **па 10 злоты.** Ад Д-ра Антаневіча-Овэрко, П. Бандарэвіча — **па 12 зл.**

Ад С. Казэкі,—25 зл. 80 гр., ад Гальяша Опально—1 зл. 60 гр., ад Сымона Сяляўкі — 2 зл. 50 гр., ад Міхала Шырко,—2 зл. 80 гр.

Волчыку, „Сьнягоўскаму“, „Праныры“, „Вію“ — „Тутэйшаму“, „Вясковаму“, „Антосю Адзінокаму“, „Зудзе“, „Селяніну“, „Беларусу“, „Лістападзяну“, „Праўдзіваму“, П. Осененку, К. К—ль, „Новаму“, Калачу, „Дэлятыцкаму Дзядзьку“, „Перцу“, „Маленькай Птушцы“, „Маленькаму 1—та“, „Закутніку“, В. Підалкевічу, „Праезжы“, „Птушка Трэцякоў“, Д—ову, „Праходзячаму“, „Гаротніку“, „Мікалаю Птушцы“, „Адзінокаму“, „Праксэдзе Кучуковіч“, „Тодару Грушы“.

Ад усіх атрымалі. Дзякуем. Што ня страціць сваей актуальнай вартасьці, у сваім часе будзе выкарыстана.

Рэдактар-Выдавец **Антон Пракапеня.**

Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22.